# ПРА СТАРАВЕРАЎ БЕЛАРУСКАГА ПААЗЕР'Я



**У Цэнтральнай навуковай бібліятэцы НАН Беларусі прайшла прэзентацыя калектыўнай манаграфіі «Старaверы беларускага Паазер'я: гісторыя і культура», якая ўбачыла свет у Выдавецкім доме «Беларуская навука». Гэта вынік комплекснага даследавання гісторыі і культуры рускіх стараверaў, якія рассяліліся на тэрыторыі Паўночна-Заходняй Беларусі.**

Старaверы – спецыфічная рэлігійная група, якая перасяляецца ў канцы XVII стагоддзя на тэрыторыю Беларусі з расійскіх земляў. Нашчадкі тых людзей падзяліліся з навукоўцамі сваімі гісторыямі, жыццёвым досведам, што і стала асновай многіх апавяданняў, разважанняў і аналізу на старонках гэтага выдання.

«Ідэя кнігі зарадзілася неяк спантанна, на адной з навуковых канферэнцый прыйшлі да высновы: у нашай краіне няма агульнай калектыўнай манаграфіі, якая аб'ядноўвала б усе веды, што тычацца гэтай спецыфічнай канфесійнай групы. Кніга фактычна паўстала ў 2021 годзе, калі мы вызначыліся з тым, якія раздзелы ў ёй будуць, бо на той перыяд меўся значны досвед у вывучэнні іншых рэгіёнаў – літоўскай, латвійскай тэрыторый, і было вельмі дзіўна, што ў выданнях па старaверству Усходняй Еўропы Беларусь прадстаўлена толькі Веткаўскім раёнам», – сказаў адзін з асноўных аўтараў дацэнт кафедры гісторыі і сацыягуманітарных навук Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта Уладзімір Аўсейчык (**на фота**).

Было прынята рашэнне правесці комплекс даследаванняў і экспедыцый. Удзельнічалі ў гэтым Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, Веткаўскі музей стараабрадніцтва, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, што заклала аснову да будучай кнігі.

На беларускіх землях старaверы пражываюць у трох асноўных цэнтрах. Гэта найперш Гомельска-Веткаўска-Бабруйскі рэгіён, другі – Віцебск-Полацк, трэці – паўночна-заходні рэгіён, якому і прысвечана манаграфія: тэрыторыя Браслаўскага, Шаркаўшчынскага, Мёрскага, Глыбоцкага і Пастаўскага раёнаў, а таксама памежныя рэгіёны Мінскай і Гродзенскай абласцей. Фактычна ва ўсіх гэтых рэгіёнах былі ажыццёўлены экспедыцыі. Змест кнігі атрымаўся гістарычна-этнаграфічна-мастацтвазнаўчым.




«Гісторыю і культуру старaвераў пачалі вывучаць даўно, але так склалася, што менавіта навуковы падыход развіўся толькі ў некаторых кірунках. У першую чаргу гэта мовазнаўства і лінгвістычныя даследаванні. Вялікі ўнёсак у вывучэнне гаворак старaвераў Беларусі зрабілі даследчыкі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта, ёсць таксама музыкалагічнае даследаванне, а вось гістарычнага і мастацтвазнаўчага асэнсавання не было. Я напісаў раздзелы, прысвечаныя гісторыі вывучэння, фарміравання і развіцця гэтай групы, а таксама асаблівасці іх традыцыйнай культуры і культавага дойлідства. Раздзел, прысвечаны народнаму тэкстылю старaвераў, зрабіла мастацтвазнаўца і этнограф Вольга Лабачэўская. Пра замоўныя традыцыі старaвераў паўночна-заходняй Беларусі напісала загадчык аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Таццяна Валодзіна. Пра іканапісныя традыцыі расказала супрацоўнік Веткаўскага музея стараабрадніцтва Вольга Афанасьева, а яе калега Святлана Лявонцьева стала аўтарам раздзела, прысвечанага кніжнай традыцыі старaвераў беспапоўцаў. Праводзіліся як архіўная праца, так і палявыя даследаванні. Таму на старонках гэтага выдання можна сустрэць архіўныя матэрыялы і вялікую колькасць фотаздымкаў з прыватных архіваў і калекцый саміх жыхароў рэгіёна», – адзначыў Уладзімір Аўсейчык.

Кніга адметная тым, што ў ёй ідзе гаворка пра асаблівасці гаспадарчай дзейнасці і матэрыяльнай культуры, традыцыйнай абраднасці, культавага дойлідства, іканапісу, кніжнай культуры. Упершыню ўводзіцца ў навуковы ўжытак вялікі блок матэрыялаў палявых даследаванняў, архіўных крыніц.

Алена ГАРДЗЕЙ
Фота аўтара, «Навука»